# ПАВЫШЭННЕ АРФАГРАФІЧНАЙ ПІСЬМЕННАСЦІ ВУЧНЯЎ ПРАЗ РЭАЛІЗАЦЫЮ СЕНСАМАТОРНАГА МЕТАДУ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

**Сінкевіч Ірына Леанідаўна,**
настаўнік вышэйшай катэгорыі ДУА "Суйкаўская базавая школа Віцебскага раёна"

***Сенсаматорны метад – лепшы шлях для развіцця арфаграфічнай пісьменнасці***

*Фарміраванне арфаграфічных навыкаў – вельмі складаная задача для настаўнікаў беларускай мовы.*

*Цяжкасці ў авалоданні арфаграфічнымі нормамі выкліканы шматлікімі прычынамі: невялікай колькасцю гадзін, адведзенай на вывучэнне прадмета, зніжэннем цікавасці дзяцей да чытання, абмежаваннем слоўнікавага запасу. Ва ўмовах білінгвізму навучэнцы змешваюць вымаўленне гукаў і правілы перадачы іх на пісьме ў абедзвюх мовах. На ўласным вопыце перакананы, што пры вывучэнні арфаграфічных тэм часта назіраецца механічнае запамінанне вучнямі зместу правіла без яго разумення. У такім выпадку дзеці не могуць прымяніць яго на практыцы, дапускаюць памылкі, таму і вырашына стварыць сваю сістэму эфектыўных прыёмаў запамінання арфаграфічных правіл і слоўнікавых слоў для павышэння пісьменнасці на ўроках беларускай мовы.*

*Дадзены вопыт быў абагульнены на раённым вучэбна-метадычным аб'яднанні, а таксама на курсах павышэння кваліфікацыі ў ДУДАД "Віцебскі абласны інстытут развіцця адукацыі".*

Арганізацыя працэсу пазнання звязана са шматлікімі псіхалагічнымі фактарамі. Псіхолагі вылучаюць тры асноўныя каналы ўспрымання: візуальны, аўдыяльны і кінестэтычны. Аднак ёсць інфармацыя, якая можа ўспрымацца некалькімі аналізатарамі адначасова. Важнай умовай высокай прадуктыўнасці памяці з'яўляецца як мага больш актыўнае выкарыстанне ўсіх аналізатараў пры ўспрыманні інфармацыі, таму і вырашына ў дадзенай педагагічнай дзейнасці выкарыстоўваць менавіта сенсаматорны метад. Сістэмнае выкарыстанне на вучэбных занятках эфектыўных прыёмаў, праз якія рэалізуецца гэты метад, дазваляе павысіць арфаграфічную пісьменнасць вучняў.

Сенсаматорны метад рэалізуецца праз прыёмы, заснаваныя на сенсорных і маторных дзеяннях. Сваю сістэму працы па тэме вопыту можна прадставіць у выглядзе наступнай схемы.

У псіхалогіі і фізіялогіі тэрмін "сенсорны" абазначае "дадзены ў адчуваннях", а "маторны" – той, які мае дачынне да руху мышцаў. Людзі могуць успрымаць навакольны свет рознымі шляхамі. Аўдыялы лепш успрымаюць інфармацыю на слых, візуалы – праз зрок, кінестэтыкі – абапіраючыся на пачуццёвы вопыт і эмоцыі. У псіхалогіі гэтыя спосабы ўспрымання свету называюцца мадальнасцямі.

Сёння распрацавана шмат тэстаў на вызначэнне дамінуючай перцэптыўнай мадальнасці. Мы выкарысталі ў сваёй дзейнасці метад назірання і паўтарылі эксперымент заснавальніка нейрапсіхалогіі А.Р. Лурыя. Заключаецца ён у наступным: вучням прапануецца пакласці на лоб лісток паперы і напісаць на ім слова "кот". Тыя, хто піша слова "кот", знаходзяцца ў візуальнай мадальнасці, а тыя, хто піша слова "ток", – у кінестэтычнай.

Пасля правядзення дыягностыкі і яе апрацоўкі высветлілася, што 62% вучняў – візуалы, 27% – аўдыялы, 11% – кінестэтыкі. Псіхолагамі даказана, што вучні з нізкай канцэнтрацыяй




увагі – кінестэтыкі, з сярэднім узроўнем – аўдыялы, з высокім – візуалы, таму і арганізоўваем адукацыйны працэс, улічваючы індывідуальныя асаблівасці ўсіх дзяцей класа.

Апішам некаторыя эфектыўныя, на наш погляд, прыёмы, праз якія рэалізуецца сенсаматорны метад і якія дапамагаюць вучням павысіць арфаграфічную пісьменнасць.

Прыём *"шматразовы запіс слова"* станоўча ўплывае на фарміраванне арфаграфічных навыкаў, таму што ў працэсе шматразовага запісу слоў актыўна дзейнічае рухальная памяць. Паўтарэнне рукарухальных дзеянняў праз пэўныя інтэрвалы часу адыгрывае важную ролю, бо пры аднаразовым напісанні слова неабходны арфаграфічны навык не выпрацоўваецца**.**

Напрыклад, пры вывучэнні слоўнікавага слова *калекцыя* прапануецца вучням наступныя практыкаванні:

1. Расшыфруйце і запішыце слоўнікавае слова.

| 3 | 1 | 7 | 2 | 8 | 5 | 4 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| л | к | ы | а | я | к | е | ц |

2. Запішыце верш.

Дзве сяброўкі – Лена з Верай –
Гэта *калекцыянеры*.
У сяброўак у двух альбомах
Прозвішч сто ўсім знаёмых, –
Не *калекцыя*, а клад!
Знакамітыя артысты,
Футбалісты, хакеісты
І паэт-лаўрэат.

Растлумачце, як вы разумееце значэнне выдзеленых слоў. А што калекцыяніруеце вы?

3. Запішыце аднакаранёвыя словы і растлумачце іх лексічнае значэнне.

Калекцыя, калекцыйны, калекцыяніраваць, калекцыянер.

З вышэй запісанымі словамі складзіце сказы.

На этапе праверкі дамашняга задання выкарыстоўваем метадычны прыём *"дыктант для шпіёна"*, які дазваляе развіваць зрокавую памяць, трэніраваць уважлівасць, адказнасць за канчатковы вынік. Падбіраем тэкст з вялікай колькасцю слоў на раней вывучанае арфаграфічнае правіла. Дзелім клас на 2 групы, на столькі ж частак тэкст і вывешваем лісты з кожнай часткай на сцяне далей ад каманды, для якой яны прызначаны. Кожны з членаў каманды павінен пабываць у ролі "шпіёна". "Шпіён" падыходзіць да сваёй часткі тэксту, чытае сказ, запамінае, вяртаецца да сваёй каманды і дыктуе ёй сваю частку. Перамагае тая каманда, якая справіцца з працай раней і не зробіць памылак (ці дапусціць іх меншую колькасць).

Пры вывучэнні тэмы "Вымаўленне і правапіс галосных е, ё, я" ў 5 класе выкарыстоўваем прыём *"ведаў – хачу даведацца – даведаўся"*. Даецца пісьмовае заданне, з якім паспяхова справяцца ўсе дзеці (напрыклад, уставіць прапушчаныя літары ў словах: л…сны, в…сна, м…довы, в…сковы, б…роза). Вучням неабходна растлумачыць арфаграму і запоўніць калонку табліцы "Ведаў". Як правіла, усе вучні класа ведаюць, што ў першым складзе перад націскам замест **е, ё** пішацца літара **я**.

Пасля гэтага раздаем кожнаму тэкст, у якім выкарыстаны шэраг запазычаных слоў. Тэкст прыдуманы нездарма, бо, на нашу думку, добры спосаб нешта запомніць – прыцягнуць уяўленне. Вучні змогуць выразна ўявіць сабе тое, пра што будзе ісці аповед у тэксце. Так запазычаныя словы запомняцца значна лягчэй.

Спачатку тэкст чытаецца ўслых.

*Герой Герасім ехаў на метро. На яго грудзях паблісквaў медаль. Аб'явілі прыпынак, і праз некалькі секунд ён выйшаў на перон. У яго было*

*шмат планаў. Ён павінен быў наведаць карцінную гал**е**рэю, дзе праходзіла выстаўка п**е**йзажаў, дапамагчы ўнуку зрабіць г**е**рбарый і патрапіць на сп**е**ктакль. А пакуль ён зойдзе ў краму і купіць к**е**фір, з**е**фір і б**е**зэ.*

Дзецям даецца заданне выпісаць словы з выдзеленымі літарамі ў сшытак і паставіць у іх націскі. Як правіла, вучні заўважаюць, што падкрэсленая літара **е** пішацца ў 1-м складзе перад націскам, і таму ў іх узнікае пытанне: чаму? Цяпер яны запаўняюць другую калонку табліцы “Хачу даведацца”.

Высвятляем, ці ўсе вучні ведаюць лексічнае значэнне слоў з падкрэсленымі літарамі. Калі трэба, то тлумачыцца іх значэнне. Звяртаецца ўвага на тое, што гэта запазычаныя словы.

На дошку выпісваем у два слупкі словы *вясна, лясны, мядовы, гербарый, безэ, зефір.* Затым вучням трэба параўнаць пары слоў і паспрабаваць сфармуляваць правіла. Пасля гэтага дзеці чытаюць правіла і запаўняюць калонку табліцы “Даведаўся”.

Пры вывучэнні тэмы “Правапіс і, ы, й пасля прыставак» выкарыстоўваем прыёмы, заснаваныя на мнематэхніцы. Усім вучням класа прапануецца папрацаваць з кластарам (Дадатак 1).

*Пытанне вучням: ад чаго залежыць правапіс і, ы, й пасля прыставак?*

Дзеці павінны разгледзець кластар і паспрабаваць растлумачыць, калі пішацца і, ы, й пасля прыставак. Зразумела, што такі прыём выкарыстоўваецца для ўсяго класа, але найбольш прыдатны ён для візуалаў. Менавіта яны ўспрымаюць інфармацыю ў выглядзе яркіх малюнкаў і зрокавых вобразаў.

Для вучняў-аўдыялаў прыдуманы мнеманічныя вершы (Дадатак 2), якія раздаюцца кожнаму вучню. Спачатку вершы чытае настаўнік. На дошцы папярэдне запісаны словы на кожны падпункт правіла. Прапаноўваецца вучням суаднесці слова з адпаведным вершам-правілам. Дома вучні вывучаць гэтыя мнеманічныя вершы на памяць.

На этапе замацавання новай тэмы вучням-кінестэтыкам рэкамендуем прыняць удзел у гульні “Складзі слова”. Словы складаюцца пры дапамозе алгарытмаў.

Удзельнікам гульні раздаюцца алгарытмы (Дадатак 3) і 2 канверты, у адным з якіх знаходзяцца прыстаўкі на галосны і зычны, а ў другім – часткі слоў без прыставак. Вучні павінны далучыць да прыстаўкі частку слова і абгрунтаваць свой выбар (вы + йграць, пад + ыграць, за + йграць).

Пры вывучэнні тэмы “Цвёрдыя і мяккія зычныя, іх вымаўленне і правапіс” абавязкова звяртаецца ўвага вучняў на такую з’яву, як суседняя мяккасць. Прапаноўваецца запісаць сказ:

*Лёня і Зося – дзеці.*

Вучням даецца заданне выпісаць з гэтага сказа ўсе зычныя гукі ( [л’], [н’], [з], [с’], [дз’], [ц’]). Далей тлумачыцца, што ўсе гэтыя гукі, апрача першага, могуць змякчацца ў пэўнай пазіцыі:

гукі [з], [с] – перад усімі мяккімі зычнымі, акрамя [г’], [к’], [х’]: [з’м’эна];

гукі [д], [т] – перад мяккім [в’] і [м’]: дзве, Дзмітрый;

гук [н] – перад [л’], [н’], [з’], [с’], [дз’], [ц’] (усе зычныя гукі з вышэй прыведзенага сказа) і перад [й’]: [сан’л’івы], [сон’н’ік], [гартэн’з’ій’а], [п’эн’с’ій’а’], [каман’дз’ір], [ін’дз’эй’эц], [ман’ц’ор]. (Выключэнне: падманлівы, бензін, транзіт, кан’юнктура, кан’юнктыў.)

Пры вывучэнні свісцячых зычных запісваем на дошцы сказ: *Зося – дзіця.* Звяртаем ўвагу вучняў на літары з, с, дз, ц: менавіта гэтыя літары абазначаюць свісцячыя гукі, якіх у беларускай мове 8: мяккія [з’], [с’], [дз’], [ц’]; цвёрдыя [з], [с], [дз]; зацвярдзелы [ц].

Ведаць свісцячыя трэба для захавання арфаграфічных нормаў, калі ў сказе стаяць побач свісцячы і шыпячы.

Для таго, каб паспяхова засвоіць правапіс змякчальнага і раздзяляльнага мяккага знака, зноў звяртаецца ўвага вучняў на сказ: *Лёня і Зося – дзеці.* Дзяцям неабходна вызначыць усе літары, якія служаць для абазначэння зычных гукаў: л, н, з, с, ц, дз (дзве літары для абазначэння гука). Падкрэсліваем яшчэ раз, што гэтыя літары спатрэбяцца нам для запамінання правіл, дзе будуць абазначаць толькі мяккія гукі.

Правіла першае: у беларускай мове толькі пасля гэтых літар пішацца змякчальны мяккі знак на канцы слова ці ў сярэдзіне слова перад зычным.

Для прыкладу прапануем мнеманічны верш:

*Боль, мазоль, санькі, дзянькі,*
*Князь, карась, бацькі, дзядзькі.*
*Хрэсьбіны,носьбіт, жэньшэнь і смяльчак…*
*Пішуцца толькі праз мяккі знак.*

Правіла другое: у беларускай мове толькі пасля гэтых літар у сярэдзіне слова перад *е, ё, ю, я, і* пішацца раздзяляльны мяккі знак.

Для прыкладу зноў прапануем мнеманічны верш:

*Праз раздзяляльны мяккі знак пішы:*
*Більярд, мільярд, каньяк,*
*Мадзьяр, пасьянс і шампіньён,*
*Кальє, парцьеры і каньён.*

А вось запомніць зацвярдзелыя зычныя вучням дапамагае сказ *Рыцар Джордж рэжа шар у чашы.* Прапануем вучням выпісаць са сказа ўсе літары, якія абазначаюць зычныя гукі. Усе гэтыя гукі зацвярдзелыя. Іх у беларускай мове 6: [р], [ц], [дж], [ж], [ш], [ч]. Каб сказ не забыўся, рэкамендуем зрабіць ілюстрацыю да яго.

Падчас працы са слоўнікавымі словамі можна заўважыць, што вялікую цяжкасць выклікае

правапіс запазычаных слоў. Калі пачалі выкарыстоўваць прыём “зрокавае запамінанне слоў”, вучні сталі дапускаць значна меней памылак.

Напрыклад, вучням неабходна адшукаць словы, якія “схаваліся” ўнутры запісаных на дошцы запазычаных слоў:

**Канцы**лярыя – канцы; **рыс**ора – рыс; а**плады**сменты – плады; **рэпер**туар – рэпер; **бры**зент – брыз; **прэс**тыж – прэс; во**клад**ка – клад; кан**цэнтр**ацыя – цэнтр і г.д.

Важна, каб асацыяванне праводзілася шляхам актыўнага зрокавага ўяўлення. Так, для эфектыўнасці запамінання вылучаныя вышэй словы просім вучняў выдзеліць іншым колерам.

Актуальным пры вывучэнні слоўнікавых слоў з’яўляецца і прыём “выдзяленне пэўных літар колерам і памерам”. Запісваем на дошцы словы на адно правіла і арфаграму выдзяляем іншым колерам і больш буйным памерам:

ДЭбаты, ДЭлегат, ДЭбют, ДЭвіз, ДЭфіс, ДЭградацыя, ДЭвальвацыя, ДЭканат… (Значэнні незразумелых слоў тлумачацца).

Дзейсным, на нашу думку, з’яўляецца і метадычны прыём *“адшукай памылку”*. Клас дзеліцца на 2 каманды. Кожная каманда загадзя (дома) рыхтуе тэкст з памылкамі на пэўную тэму. На ўроку каманды мяняюцца тэкстамі і шукаюць памылкі ў тэксце каманды-саперніцы. Карысць абаюдная: чыя каманда лепш “схавае” свае памылкі і хто больш і хутчэй адшукае іх.

На этапе замацавання новай тэмы выкарыстоўваем прыём *“канцэнтрацыя”*. Клас дзеліцца на групы, кожная з якіх атрымлівае канверты з тэкстам. Вучням адводзіцца пэўны час на чытанне. Затым кожны вучань запісвае ў сшытак тое, што запомніў. Пасля гэтага ўся група запісвае сумесны тэкст на асобным лісце. Перамагае група, якая найбольш поўна перадасць змест тэксту і зробіць меншую колькасць памылак.

Прыём“увага”выкарыстоўваецца пры вывучэнні новага матэрыялу і пры яго замацаванні. Клас дзеліцца на 2 каманды. Вывешваецца на дошцы плакат, на якім рознымі колерамі, буйным і дробным шрыфтам удоўж і ўпоперак напісаны 10–15 слоў (Дадатак 4).

Словы павінны быць бачны здалёк. На тое, каб запомніць словы, даецца 2 хвіліны. Затым плакат здымаецца, а вучні запісваюць усе словы, якія запомнілі. Каманды абменьваюцца сваімі запісамі, правяраюць адна адну, тлумачаць правапіс, калі тэма ўжо пройдзена, і шукаюць супярэчнасці на этапе вывучэння новага матэрыялу. Напрыклад, чаму ў некаторых словах пасля галосных не пішацца ў?

Пры праверцы правільнасці выкананага задання плакат абавязкова зноў вывешваецца на дошку. Словы, якія не запомніла каманда-саперніца, дапісваюцца ўсімі вучнямі.

Дадзеная педагагічная практыка паказала, што абраныя метадычныя прыёмы і сістэма заданняў з’яўляюцца эфектыўнымі і даюць станоўчыя вынікі.

Выкарыстаць прапанаваны вопыт па фарміраванні і павышэнні арфаграфічнай пісьменнасці вучняў могуць настаўнікі, якія здзяйсняюць навучанне на любой з трох ступеняў агульнай сярэдняй адукацыі.

У распрацаванай намі сістэме заданняў дастаткова такіх, якія можна адаптаваць да ўрока па любой тэме, тым больш, што ствараць асаблівыя ўмовы для іх выкарыстання не трэба.

## ДАДАТАК

**Дадатак 1**

**Кластар**

| Пасля прыставак на галосны | Пасля прыставак на зычны |
|---|---|
| ***Й*** | ***Ы*** |
| да***й***сці | пад***ы***сці |
| за***й***граць | раз***ы***граць |
| вы***й***грыш | уз***ы***сці |
| па***й***менны | ад***ы***мчаць |

**Правапіс *і, ы, й* пасля прыставак**

**Выключэнні з правіла**

**Пішам *і***

**Пасля прыставак на галосны, калі *і* ўтварае склад**

↓

за***і***нтрыгаваць

за***і***кацца

**Пасля прыставак на зычны між-, звыш-, контр-, транс-, пан-, пост-, супер**

↓

між***і***нстытуцкі

звыш***і***мклівы

контр***і***гра

**Дадатак 2**

**Мнеманічныя вершы**
**Правапіс *і, ы, й* пасля прыставак**

**Й** 1) Пасля прыстаўкі на галосны,
не забывай ніколі,
мы пішам ў корані слова
толькі **і нескладовае**:
вы**й**граць, за**й**мець, пера**й**маць,
па**й**менны, пры**й**сці, пера**й**граць.

**Ы** 2) Сам цвёрда запомні правіла,
Таксама сябрам скажы:
Пасля прыстаўкі на зычны
Пішацца літара ***ы.***

**І** 3) За***і***скрыцца, за***і***кацца, за***і***нтрыгаваць...
Літара ***і*** захавалася,
Бо гук [і] утварае склад.

**І** 4) **Між, звыш, контр, транс, пан, пост… –**
Выключэнні з правіл ёсць.
Запомніць трэба назаўжды:
Бачыш гэту прыстаўку –
Пішы толькі ***І***!
Між***і***нстытуцкі, пост***і***ндустрыялізацыя,
Контр***і***дэя і супер***і***нфляцыя.

**Дадатак 3**

**Правапіс *і, ы, й* пасля прыставак**

*Алгарытм 1*

2. Паглядзіце, на зычны ці на галосны заканчваецца прыстаўка.
3. Калі прыстаўка заканчваецца на галосны, то паглядзіце, ці ўтварае склад каранёвы **[і]**.
4. Калі **[і]** ўтварае склад, то пасля прыстаўкі трэба пісаць літару **і**.
5. Калі **[і]** не ўтварае склад, то пасля прыстаўкі пішацца літара **й**.

*Алгарытм 2*

1. Паглядзіце, на зычны ці на галосны заканчваецца прыстаўка.
2. Калі прыстаўка заканчваецца на зычны, то паглядзіце, ці не адносіцца яна да выключэнняў. (Выключэнні: прыстаўкі між-, звыш-, контр-, транс-, пан-, пост-, гіпер-, супер.)
3. Калі прыстаўка адносіцца да выключэнняў, то пасля прыстаўкі пішыце літару **і**.
4. Калі прыстаўка да выключэнняў не адносіцца, то пішыце літару **ы**.

**Дадатак 4**

уздоўж

трыумф

паўза

фрау

ток-шоу

саксаул

фаўна

соус

страус

РАДЫУС

аул

Клоўн

воўк

шоўк

шлагбаум

БАУЛ